Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 46 (5172)
ЛЮТЫ
25
ПАНЯДЗЕЛАК
1935 г.
год выдання XVIII

## СЕННЯ АДКРЫВАЕЦЦА III УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД РАБСЕЛЬКОРАЎ

**Камандзірам пролетарскай грамадскай думкі, бесстрашным байцам за справу соцыялізма— палкае большэвіцкае прывітанне!**

# ДРУК—ГЭТА САМАЯ ВОСТРАЯ, САМАЯ МОЦНАЯ ЗБРОЯ НАШАЙ ПАРТЫІ (СТАЛІН).

## БАЯВОЕ ПРЫВІТАННЕ КОНАРМЕЙЦАМ

ПРЫВІТАННЕ БАЙЦАМ, КАМАНДЗІРАМ І ПАЛІТРАБОТНІКАМ КОННАЙ АРМІІ, РАЗБІЎШАЙ ПОЛЧЫШЧЫ ВОРАГАЎ СОВЕЦКАГА САЮЗА І ПРАГНАЎШАЙ ВОН З НАШАЙ КРАІНЫ ГРАБЕЖНІКАЎ—ІНТЭРВЕНТАЎ.

ПРЫВІТАННЕ ТАВАРЫШАМ **ВАРАШЫЛАВУ, БУДЗЁННАМУ, ШЧАДЗЭНКА**—БУДАЎНІКАМ І ПРАВАДЫРАМ КОННАЙ АРМІІ.

ГІСТОРЫЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ ЎПРЫГОЖАНА ВАШЫМІ СЛАЎНЫМІ ПЕРАМОГАМІ, ТАВАРЫШЫ КОНАРМЕЙЦЫ! ВАША ХРАБРАСЦЬ І АДВАГА СЛУЖАЦЬ ПРЫКЛАДАМ ДЛЯ НАШАЙ МОЛАДЗІ.

БУДЗЕМ СПАДЗЯВАЦЦА, ШТО ВОСТРЫЯ ШАБЛІ І МЕТКІЯ КУЛІ ЧЫРВОНАЙ КОННІЦЫ, КАЛІ ГЭТАГА ПАТРЭБУЕ АБСТАНОЎКА, ТАК-ЖА ДОБРА ПАСЛУЖАЦЬ СПРАВЕ АБАРОНЫ НАШАЙ ВЯЛІКАЙ РАДЗІМЫ, ЯК СЛУЖЫЛІ ЯНЫ Ў НЯДАЎНІМ МІНУЛЫМ.

**І. СТАЛІН.**

## *Прывітанне ЦК ВКП(б)*

ЦК ВКП(б) горача вітае байцоў, камандзіраў і палітработнікаў гераічнай Першай коннай арміі ў дзень 15-годдзя яе стварэння.

Натхняемая нашай партыяй, пад кіраўніцтвам тт. **Варашылава і Будзённага,** Першая конная армія пакрыла сябе неўвядаемай славай баявымі дзеяннямі на паўднёвым і польскім франтах і пад Перакопам упісала бліскучыя старонкі ў гісторыю грамадзянскай вайны і Чырвонай арміі. Рэволюцыйная мужнасць і адвага байцоў **Першай коннай** назаўсёды павінны астацца прыкладам для маладых пакаленняў байцоў, абаронцаў нашай вялікай радзімы.

Захоўвайце, таварышы, вашы слаўныя баявыя традыцыі!

Насіце з годнасцю званне байцоў, камандзіраў і палітработнікаў слаўнай Першай коннай арміі! Будзьце прыкладам чырвонаармейскай дысцыпліны і арганізацыі, свядомасці і культурнасці, будзьце ўзорам у аўладанні мастацтвам і тэхнікай ваеннай справы.

**ЦК ВКП(б).**

## К 15-ГОДДЗЮ ПЕРШАЙ КОННАЙ АРМІІ

Совет Народных Камісараў Саюза ССР у сувязі з 15-годдзем Першай коннай арміі горача вітае яе слаўных камандзіраў, палітработнікаў і байцоў.

Створаная па ініцыятыве тав. Сталіна, Першая конная армія пад моцным большэвіцкім кіраўніцтвам і баявым камандаваннем таварышоў Варашылава і Будзённага адыграла выдатную ролю ў разгроме белагвардзейскіх армій на Паўднёвым і Заходнім франтах, стаўшы адной з самых гераічных часцей Чырвонай арміі.

Совет Народных Камісараў упэўнен у тым, што рабоча-сялян-




## *В. І. Ленін*

## ТЭЛЕГРАМА КУРСАМ КАМАНДНАГА СКЛАДУ Ў ПЕТРАГРАДЗЕ

18-IX 1918 г.

**Петраград, Васільеўскі востраў, Кадзецкая лінія, 3. Акруговаму камісару.**

Вітаю 400 таварышоў рабочых, канчаючых сёння курсы каманднага складу Чырвонай арміі і ўступаючых у яе рады, як кіраўнікі. Поспех расійскай і сусветнай соцыялістычнай рэволюцыі залежыць ад таго, з якой энергіяй рабочыя будуць брацца за ўмацаванне дзяржавы і за камандаванне арміяй працоўных і эксплаатуемых, якія ваююць за звяржэнне ярма капітала. Вось чаму я ўпэўнен, што прыкладу чатырохсот паследуюць яшчэ тысячы і тысячы рабочых, а з такімі адміністратарамі і камандзірамі перамога комунізма будзе забяспечана.

**Старшыня Соўнаркома ЛЕНІН.**

(Даны дакумент перадан «Правде» інстытутам Маркса-Энгельса-Леніна).

## ЗАГАД АРМІЯМ ПАЎДНЁВАГА ФРОНТА РАСІЙСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

**19 лістапада 1919 г.**

**№ 1801.**

**г. Серпухоў.**

У адпаведнасці з пунктам 1 пратакола № 68 пасяджэння РВС рэспублікі ад 17 гэтага лістапада загадваем:

1) Першы Конны корпус Паўднёвага фронта ў яго цяперашнім складзе перайменаваць у конную армію РСФСР.

2) Камандуючым коннай арміі назначаецца тав. Будзённы.

3) Членамі Рэвваенсовета коннай арміі назначаюцца тт. Варашылаў і Шчадэнка.

4) Канчатковае рашэнне аб складзе коннай арміі адкладваецца да прадстаўлення Рэвваенсоветам гэтай арміі праекта палажэння і штатаў палявога яе кіравання на зацвярджэнне Рэвваенсовета Паўднёвага фронта.

**Часова камандуючы ЕГОРАЎ.**

**Члены Рэвваенсовета Паўднёвага фронта СТАЛІН, Л. СЕРАБРАКОЎ** (па штабу фронта).

## НАТХНІЦЕЛЮ І АРГАНІЗАТАРУ НАШЫХ ПЕРАМОГ

**Прывітанне пленума Менгорсовета**

**Дарагі таварыш Сталін!**

Пленум Менскага гарадскога совета ад імя працоўных сталіцы

ступную крэпасць соцыялізма, надзейнейшы аплот сусветнай рэволюцыі.

